# Кантрольныя заданні
# па вучэбнай дысцыпліне
# “ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ”

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёў 2008

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
УСТАНОВА АДУКАЦЫІ "МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
УНІВЕРСІТЭТ Імя А.А. КУЛЯШОВА"

# Кантрольныя заданні па вучэбнай дысцыпліне "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ"

*Аўтар-складальнік*
Л.Г. Бараноўская

Магілёў 2008

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

УДК 070(476)(076.1)
ББК 76.01(2Б)я6
К64

*Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета МДУ імя А.А. Куляшова*

**Рэцэнзент**
**кандыдат гістарычных навук дацэнт**
***І.А. Пушкін***

:64 **Кантрольныя** заданні па вучэбнай дысцыпліне "Гістор рускай журналістыкі" / Аўт.-склад. Л.Г. Бараноўская. – МДУ імя А.А. Куляшова, 2008. – 56 с.

У рабоце змешчаны тэсты па вучэбнай дысцыпліне "Гісторыя беларускай журналістыкі", якія ўяўляюць сабой комплекс заданняў па выяўленню ведаў па гісторыі станаўлення і развіцця сродкаў масавай інфармацыі Беларусі.

Кантрольныя заданні прызначаны для самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў, а таксама для сістэматызацыі ведаў усіх, хто цікавіцца гісторыяй беларускай журналістыкі.

© Бараноўская Л.Г., складанне, 2008
© МДУ імя А.А. Куляшова, 2008

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

"Гісторыя беларускай журналістыкі" – гэта вучэбная дысцыпліна, якая займае асаблівае месца ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыяльнасці "Журналістыка", бо накіравана на вывучэнне гісторыі станаўлення і развіцця сродкаў масавай інфармацыі Беларусі.

Структура "Кантрольных заданняў па вучэбнай дысцыпліне "Гісторыя беларускай журналістыкі" накіравана на аптымізацыю арганізацыі самастойнай работы студэнтаў па дадзенай вучэбнай дысцыпліне. У метадычных рэкамендацыях прапанавана дваццаць блокаў, сярод якіх – узнікненне перыядычнага друку на Беларусі, стварэнне і развіццё беларускага радыё, журналістыка Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI стагоддзяў, мас-медыя беларускага Інтэрнэту і іншыя тэмы. Кожны з прапанаваных складальнікам блокаў змяшчае ў сабе пятнаццаць варыянтаў тэстаў.

Да кожнай тэмы прапанавана пятнаццаць варыянтаў тэставых заданняў. Студэнтам прапанаваны кантрольныя заданні, якія звязаны як з аглядавымі тэмамі (напрыклад, характарыстыка дзейнасці газет "Наша доля", "Наша ніва", беларуская журналістыка ў гады Вялікай Айчыннай вайны, станаўленне і развіццё электронных сродкаў масавай інфармацыі на Беларусі), так і з тэмамі вузкай скіраванасці (напрыклад, інфармацыйнае агенцтва БелТА: гісторыя стварэння і развіцця). Кожны тэст змяшчае ў сабе чатыры варыянты адказаў, адзін з якіх з'яўляецца правільным.

Змест "Кантрольных заданняў па вучэбнай праграме "Гісторыя беларускай журналістыкі" поўнасцю адпавядае Адукацыйнаму стандарту для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці "Журналістыка".

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок № 1

# УЗНІКНЕННЕ ЛЕТАПІСАННЯ, КНІГАДРУКУ І ПУБЛІЦЫСТЫКІ (IX-XVI стст.)

**Варыянт 1**

**Твор "Казанне пра Барыса і Глеба" ўзнік:**

1) на мяжы XI-XII стст.; 3) у пачатку XIII ст.;
2) у пачатку XII ст.; 4) у пачатку XIV ст.

**Варыянт 2**

**Твор "Аповесць мінулых гадоў" узнік:**

1) на мяжы XI-XII стст.; 3) у пачатку XIII ст.;
2) у пачатку XII ст.; 4) у пачатку XIV ст.

**Варыянт 3**

**"Слова аб палку Ігаравым" было напісана:**

1) на мяжы XI-XII стст.; 3) у пачатку XIII ст.;
2) у пачатку XII ст.; 4) у пачатку XIV ст.

**Варыянт 4**

**Дзейнасць Кірылы Тураўскага прыпадае на гады:**

1) каля 1130 г. – каля 1182 г.; 3) 1130-1190 гг.;
2) 1130-1200 гг.; 4) 1140-1182 гг..

**Варыянт 5**

**Свецкае імя Еўфрасінні Полацкай:**

1) Прадслава; 3) Звеніслава;
2) Усяслава; 4) Вольга.

**Варыянт 6**

**Жыццё Васіля Мікалаевіча Амельяновіч-Цяпінскага прыпадае на гады:**

1) прыблізна 1540-1603 гг.; 3) прыблізна 1560-1603 гг.;
2) прыблізна 1550-1640 гг.; 4) прыблізна 1540-1645 гг.;

**Варыянт 7**

**"Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх", адзін з першых твораў уласна беларускай гістарычна-дакументальнай літаратуры, быў напісаны:**

1) у пачатку XV ст.; 3) у пачатку XII ст.;
2) на мяжы XI-XII стст.; 4) у пачатку XIII ст.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 8**

**Галоўная ідэя "Летапісца Вялікіх князёў Літоўскіх" –**

1) абгрунтаванне цэнтралізаванай палітыкі літоўскіх князёў, падтрымка іх памкненняў да ліквідацыі феадальнай раздробленасці;

2) думка аб паходжанні літоўскіх князёў ад рымскіх арыстакратаў;

3) барацьба праваслаўя супраць каталіцтва;

4) ідэя нацыянальнага адраджэння.

**Варыянт 9**

**Галоўная ідэя "Хронікі Вялікага княства княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага":**

1) абгрунтаванне цэнтралізаванай палітыкі літоўскіх князёў, падтрымка іх памкненняў да ліквідацыі феадальнай раздробленасці;

2) думка аб паходжанні літоўскіх князёў ад рымскіх арыстакратаў;

3) барацьба праваслаўя супраць каталіцтва;

4) ідэя нацыянальнага адраджэння.

**Варыянт 10**

**Твор агіяграфічнай літаратуры, у цэнтры ўвагі якога асоба Кірылы Тураўскага, называецца:**

1) "Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх";

2) "Жыціе Кірылы Тураўскага";

3) "Слова аб палку Ігаравым";

4) "Аповесць мінулых гадоў"

**Варыянт 11**

**Твор агіяграфічнай літаратуры, у цэнтры ўвагі якога – асоба Еўфрасінні Полацкай, называецца:**

1) "Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх";

2) "Жыціе Ефрасінні Полацкай";

3) "Слова аб палку Ігаравым";

4) "Аповесць мінулых гадоў".

**Варыянт 12**

**У творы "Александрыя", які быў вядомы на Русі з XI-XII ст., апавядаецца пра:**

1) жыццё Аляксандра Македонскага, яго ваенныя паходы;

2) паходжанне літоўскіх князёў ад рымскіх арыстакратаў;

3) барацьбу праваслаўя супраць каталіцтва;

4) нацыянальнае адраджэннне.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

**Варыянт 13**

**"Праўда Яраслава" – гэта:**

1) своеасаблівы звод законаў князя Яраслава Мудрага;

2) твор агіяграфічнай літаратуры;

3) адзін з першых твораў уласна беларускай гістарычна-дакументальнай літаратуры;

4) палемічны твор.

**Варыянт 14**

**"Тураўскае евангелле", узор старажытных рукапісных кніг, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі, датуецца:**

1) XI ст.; 3) XIII ст.;

2) XII ст.; 4) XIVст.

**Варыянт 15**

**"Полацкае евангелле", узор старажытных рукапісных кніг, знойдзеных на тэрыторыі Беларусі, датуецца:**

1) XI ст.; 3) XIII ст.;

2) XII ст.; 4) XIVст.

## Блок № 2

## БЕЛАРУСКАЯ ПУБЛІЦЫСТЫКА XVI – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVII ст.

**Варыянт 1**

**Вядомы асветнік Францыск Скарына нарадзіўся:**

1) у Полацку; 3) у Вільні;

2) у Мінску; 4) у Магілёве.

**Варыянт 2**

**Аўтарам "Граматики словенския правильная синтагма" з'яўляецца:**

1) А.Філіповіч; 3) С.Полацкі;

2) С. Будны; 4) М.Сматрыцкі.

**Варыянт 3**

**Гады жыцця С. Полацкага:**

1) 1629-1680 гг.; 3) 1530-1593 гг.;

2) 1540-1603 гг.; 4) 1572-1630 гг.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 4**

**Гады жыцця Васіля Мікалаевіча Амельяновіча-Цяпінскага:**

1) 1629-1680 гг.;
2) 1540-1603 гг.;
3) 1530-1593 гг.;
4) 1572-1630 гг.

**Варыянт 5**

**Гады жыцця Сымона Буднага:**

1) 1629-1680 гг.;
2) 1540-1603 гг.;
3) 1530-1593 гг.;
4) 1572-1630 гг.

**Варыянт 6**

**Гады жыцця Мялеція Сматрыцкага:**

1) 1629-1680 гг.;
2) 1540-1603 гг.;
3) 1530-1593 гг.;
4) 1572-1630 гг.

**Варыянт 7**

**10 чэрвеня 1562 г. у друкарні г. Нясвіжа выйшла першая на Беларусі кніга на беларускай мове:**

1) "Катэхізіс";
2) "Малая падарожная кніжыца";
3) "Фрынас, або Плач усяленскай усходняй царквы";
4) "Дыярыуш".

**Варыянт 8**

**У 1610 г. у Вільні М. Сматрыцкі выдаў кнігу:**

1) "Катэхізіс";
2) "Малая падарожная кніжыца";
3) "Фрынас, або Плач усяленскай усходняй царквы";
4) "Дыярыуш".

**Варыянт 9**

**Твор С. Буднага, які напісаны ў форме пытанняў і адказаў, мае чатыры часткі: пра дзесяць запаведзяў, пра сімвал веры, пра малітву Гасподню і пра таінствы, называецца:**

1) "Катэхізіс";
2) "Малая падарожная кніжыца";
3) "Фрынас, або Плач усяленскай усходняй царквы";
4) "Дыярыуш".

**Варыянт 10**

**Нарадзіўся Францыск Скарына, сын Лукі Скарыны, у Полацку:**

1) каля 1490 г.;
2) у 1517 г.;
3) у 1519 г.;
4) у 1525 г.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 11**

**Першай кнігай, выдадзенай Скарынам 6 жніўня 1517 г. у Празе была кніга:**

1) "Апостал";

2) "Малая падарожная кніжыца";

3) "Библия руска выложена доктором Францыскам Скорыною из славного града Полоцька...";

4) "Псалтыр".

**Варыянт 12**

**Галоўная ідэя выдання "Фрынаса..." – гэта:**

1) абгрунтаванне цэнтралізаванай палітыкі літоўскіх князёў, падтрымка іх памкненняў да ліквідацыі феадальнай раздробленасці;

2) думка аб паходжанні літоўскіх князёў ад рымскіх арыстакратаў;

3) барацьба праваслаўя супраць каталіцтва;

4) ідэя нацыянальнага адраджэнння.

**Варыянт 13**

**Аўтар "Катэхізіса":**

1) А.Філіповіч;
2) С.Будны;
3) С.Полацкі;
4) В.Цяпінскі.

**Варыянт 14**

**Аўтар кнігі "Фрынас, або Плач усяленскай усходняй царквы":**

1) А.Філіповіч;
2) С.Будны;
3) С.Полацкі;
4) М.Смятрыцкі.

**Варыянт 15**

**Аўтар "Дыярыуша":**

1) А.Філіповіч;
2) С.Будны;
3) С.Полацкі;
4) В.Цяпінскі.

## Блок № 3

# УЗНІКНЕННЕ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ НА БЕЛАРУСІ

**Варыянт 1**

**Калі выйшла першая друкаваная беларуская газета?**

1) у 1501 г.;
2) у 1563 г.;
3) у 1701 г.;
4) у 1750 г.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 2**

**Як называлася першая друкаваная беларуская газета?**

1) "Нясвіжская газета";
2) "Новины грозные а жалостливые...";
3) "Новины о взятии Смоленска, ";
4) "Минские губернские ведомости".

**Варыянт 3**

**Якую назву першапачаткова мела газета "Виленский вестник"?**

1) "Литовский вестник";
2) "Виленский вестник";
3) "Виленская литературная газета";
4) "Виленские губернские ведомости".

**Варыянт 4**

**Хто быў першым рэдактарам "Газеты літэрацкай віленьскай"?**

1) А. Адынец;
2) А. Кіркор;
3) Ф. Папроцкі;
4) А. Марціноўскі.

**Варыянт 5**

**Якую газету рэдагаваў А. Адынец?**

1) "Газета літэрацка віленьска";
2) "Виленский вестник";
3) "Гродненские губернские ведомости";
4) "Виленские губернские ведомости".

**Варыянт 6**

**З якіх частак складаўся "Виленский вестник"?**

1) інфармацыйная, гістарычная;
2) афіцыйная, неафіцыйная;
3) неафіцыйная, гістарычная;
4) афіцыйная, літаратурная.

**Варыянт 7**

**У якія гады газету "Виленский вестник" рэдагаваў Адам Кіркор?**

1) у 1860-1865 гг.;
2) у 1866-1870 гг.;
3) у 1871-1879 гг.;
4) у 1859-1860 гг.

**Варыянт 8**

**У якой газеце друкаваўся Сыракомля як публіцыст?**

1) "Газета літэрацка віленска";
2) "Літовскій веснік";
3) "Віленскій вестнік";
4) "Нясвіжская газета".

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 9**

**Калі газета "Виленский вестник" поўнасцю стала рускамоўнай?**

1) у 1841 г.; 3) у 1865 г.;
2) у 1863г.; 4) у 1863 г.

**Варыянт 10**

**Дзе газета "Виленский вестник" выдавалася ў 1915-1916 гг.?**

1) Вільня; 3) Мінск;
2) Гродна; 4) Гомель.

**Варыянт 11**

**На якой мове выходзіла "Газета літэрацка віленьска"?**

1) на рускай; 3) на літоўскай;
2) на польскай; 4) на беларускай.

**Варыянт 12**

**З 4 лістапада 1833 г. па просьбе Віленскага генерал-губернатара газета "Виленский вестник" стала афіцыйным двухмоўным выданне. На якіх мовах друкаваліся матэрыялы?**

1) рускай і польскай; 3) беларускай і літоўскай;
2) беларускай і польскай; 4) рускай і літоўскай.

**Варыянт 13**

**З якіх частак складалася "Віленская літаратурная газета"?**

1) інфармацыйная, гістарычная; 3) неафіцыйная, гістарычная;
2) афіцыйная, неафіцыйная; 4) афіцыйная, літаратурная.

**Варыянт 14**

**У афіцыйным аддзеле "Віленскай літаратурнай газеты" змяшчаліся:**

1) паведамленні аб міжнародных зносінах, эканоміцы, палітыцы і культуры замежных краін і інш.;
2) паведамленні пра гісторыка-палітычны працэс Беларусі;
3) інфармацыя пра развіццё асветы, літаратуры;
4) інфармацыя пра фарміраванне дэмакратычных накірункаў.

**Варыянт 15**

**У неафіцыйным аддзеле "Віленскай літаратурнай газеты" змяшчаліся:**

1) паведамленні аб міжнародных зносінах, эканоміцы, палітыцы і культуры замежных краін і інш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

2) паведамленні аб міжнародных зносінах;

3) інфармацыя аб міжнародных зносінах, аб развіцці асветы, літаратуры;

4) інфармацыя пра фарміраванне дэмакратычных кірункаў.

## Блок № 4

## ДРУК БЕЛАРУСІ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ЧАС ПАЎСТАННЯ 1863-1864 гг.

**Варыянт 1**

**Часопіс "Вестник Юго-Западной и Западной России" ("Вестник Западной России") выходзіў у:**

1) 1862-1871 гг.;
2) 1860-1870 гг.;
3) 1865-1875 гг.;
4) 1862-1880 гг.

**Варыянт 2**

**Гады жыцця Вікенція Сямёнавіча Каліноўскага:**

1) 1840-1864 гг.;
2) 1838-1864 гг.;
3) 1838-1867 гг.;
4) 1838-1869 гг.

**Варыянт 3**

**К. Каліноўскі падпісваў газету "Мужыцкая праўда" псеўданімам:**

1) Яська-гаспадар з-пад Вільні;
2) Яська-гаспадар з-пад Полацку;
3) Яська;
4) Яська-гаспадар.

**Варыянт 4**

**Пачынаў К. Каліноўскі ў газеце "Мужыцкая праўда" размову з чытачамі зваротам:**

1) "Дзяцюкі!";
2) "Народ!";
3) "Грамада!";
4) "Пане!".

**Варыянт 5**

**Колькі выйшла нумароў "Мужыцкай праўды"?**

1) 7;
2) 5;
3) 3;
4) 15.

**Варыянт 6**

**Якая колькасць матэрыялаў звычайна была прадстаўлена ў адным нумары "Мужыцкай праўды"?**

1) 1;
2) 6;
3) 2;
4) 5.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 7**

**Паводле рэлігійных поглядаў К.Каліноўскі выступаў на старонках "Мужыцкай праўды" як:**

1) праваслаўны;
2) уніят;
3) каталік;
4) мусульманін.

**Варыянт 8**

**Кастусь Каліноўскі прыняў удзел у выхадзе выдання:**

1) "Сцяг свабоды";
2) "Будильник";
3) "Друг народа";
4) "Белорусский вестник".

**Варыянт 9**

**З колькіх частак складаўся "Вестник Юго-Западной и Западной России"?**

1) 1;
2) 2;
3) 3;
4) 4.

**Варыянт 10**

**Хто рэдагаваў "Вестник Юго-Западной и Западной России"?**

1) К. Гаворскі;
2) К. Каліноўскі;
3) А. Адынец;
4) А. Марціноўскі.

**Варыянт 11**

**Дзе выходзіў "Вестник Юго-Западной и Западной России" ў перыяд з 1862 па 1864 гг?**

1) у Кіеве;
2) у Маскве;
3) у Вільні;
4) у Мінску.

**Варыянт 12**

**Ці прымаў удзел у выданні "Вестника Юго-Западной и Западной России" Адам Кіркор?**

1) ніколі не;
2) у 1864 годзе, калі рэдакцыя пераехала ў Вільню;
3) у перыяд з 1862 па 1863;
4) у 1872 г.

**Варыянт 13**

**Калі выйшаў першы нумар газеты "Сцяг свабоды"?**

1) 1 студзеня 1863 г.;
2) з 10 студзеня па 19 сакавіка 1864 г.;
3) 10 ліпеня 1862 г.;
4) 11 чэрвеня 1863 г.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 14**

**Хто з наступных асоб не прымаў удзелу ў выданні і распаўсюджанні газеты "Мужыцкая праўда"?**

1) В. Урублеўскі;
2) Б. Шварц;
3) Ф. Ражанскі;
4) К. Гаворскі.

**Варыянт 15**

**Першыя нумары "Мужыцкай праўды" з'явіліся ў:**

1) 1861 г.;
2) 1862 г.;
3) 1863 г.;
4) 1864 г.

## Блок № 5

## "ЕПАРХИАЛЬНЫЕ ВЕДОМОСТИ" Ў ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНІМ КРАІ

**Варыянт 1**

**"Епархиальные ведомости" – гэта:**

1) афіцыйныя царкоўныя газеты, якія выходзілі, як правіла, у губерн цэнтрах, бо царкоўныя адміністрацыйныя адзінкі – праваслаўныя епархіі – тэрытарыяльна адпавядалі губерням;
2) неафіцыйныя царкоўныя (праваслаўныя) выданні;
3) афіцыйныя царкоўныя (каталіцкія) выданні;
4) неафіцыйныя царкоўныя (каталіцкія) выданні.

**Варыянт 2**

**З якіх частак складаліся "Епархиальные ведомости"?**

1) інфармацыйная, гістарычная;
2) афіцыйная, неафіцыйная;
3) неафіцыйная, гістарычная;
4) афіцыйная, літаратурная.

**Варыянт 3**

**Старэйшай і найбольш вядомай сярод царкоўных выданняў лічыцца газета:**

1) "Литовские епархиальные ведомости";
2) "Минские епархиальные ведомости";
3) "Полоцкие епархиальные ведомости";
4) "Могилевские епархиальные ведомости"

**Варыянт 4**

**Дзе газета "Литовские епархиальные ведомости" выдавалася ў 1863 –1916 гг.?**

1) у Вільні;
2) у Магілёве;
3) у Мінску;
4) у Гомелі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 5**

**Гады выхаду "Литовских епархиальных ведомостей":**

1) 1863-1916 гг.;
2) 1874-1917 гг.;
3) 1883-1917 гг.;
4) 1901-1915 гг.

**Варыянт 6**

**Гады выхаду "Могилевских епархиальных ведомостей":**

1) 1863-1916 гг.;
2) 1874-1917 гг.;
3) 1883-1917 гг.;
4) 1901-1915 гг.

**Варыянт 7**

**Якое з праваслаўных выданняў Беларусі з'явілася пазней за іншыя?**

1) "Гродненские епархиальные ведомости";
2) "Минские епархиальные ведомости";
3) "Полоцкие епархиальные ведомости";
4) "Могилевские епархиальные ведомости".

**Варыянт 8**

**Як захоўвалася парадкавая нумарацыя "Епархиальных ведомостей"?**

1) захоўвалася на працягу кожнага года;
2) захоўвалася на працягу аднаго нумара выдання;
3) захоўвалася на працягу кожнага з раздзелаў выдання;
4) не захоўвалася.

**Варыянт 9**

**У афіцыйным аддзеле кожнага нумара "Епархиальных ведомостей" друкаваліся:**

1) пастановы вышэйшых царкоўных улад, распараджэнні аб вырашэнні розных сялянскіх спраў і інш;
2) пастановы вышэйшых царкоўных улад, артыкулы маральнага зместу, нарысы па гісторыі царквы, асобных, найбольш вядомых храмаў;
3) пастановы вышэйшых царкоўных улад, артыкулы маральнага зместу, урыўкі са свяшчэннага пісання;
4) артыкулы маральнага зместу, тлумачэнні малітваў і сімвалаў веры, апісанне мясцовых абрадаў, а таксама ўрыўкі са свяшчэннага пісання.

**Варыянт 10**

**У неафіцыйным аддзеле кожнага нумара "Епархиальных ведомостей" друкаваліся:**

1) пастановы вышэйшых царкоўных улад, распараджэнні аб вырашэнні розных сялянскіх спраў і інш.;
2) пастановы вышэйшых царкоўных улад, артыкулы маральнага зместу, нарысы па гісторыі царквы, асобных, найбольш вядомых храмаў;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) пастановы вышэйшых царкоўных улад, артыкулы маральнага зместу, урыўкі са свяшчэннага пісання;

4) артыкулы маральнага зместу, тлумачэнні малітваў і сімвалаў веры, апісанне мясцовых абрадаў, а таксама ўрыўкі са свяшчэннага пісання.

**Варыянт 11**

**Гады выхаду "Полоцких епархиальных ведомостей":**

1) 1863-1916 гг.;
2) 1874-1917 гг.;
3) 1883-1917 гг.;
4) 1901-1915 гг.

**Варыянт 12**

**Дзе выдавалася газета "Полоцкие епархиальные ведомости" ў 1874 –1917 гг.?**

1) у Віцебску;
2) у Магілёве;
3) у Мінску;
4) у Гомелі.

**Варыянт 13**

**Ініцыятыва па стварэнні газет "Епархиальные ведомости" належыць:**

1) каталіцкім вернікам;
2) народу;
3) губернскім уладам;
4) вышэйшай праваслаўнай іерархіі.

**Варыянт 14**

**У 80-90-я гг. XX ст. выхад "Епархиальных ведомостей" у Беларусі аднавіўся. У якім годзе адрадзіліся "Могилевские епархиальныя ведомости"?**

1) у 1989 г.;
2) у 1991 г.;
3) у 1992 г.
4) у 1995 г.

**Варыянт 15**

**"Могилевские епархиальные ведомости" ў пачатку сваёй дзейнасці ў XIX стагоддзі былі актывізаваны дзякуючы намаганням уладыкі:**

1) Віталія;
2) Сафронія;
3) Максіма;
4) Алексія.

## Блок № 6

## БЕЛАРУСКАЯ ЖУРНАЛІСТЫКА НА ПАЧАТКУ ПАРЭФОРМЕННАГА ПЕРЫЯДУ (70-80-я гг. XIX ст.)

**Варыянт 1**

**Першай публікацыяй беларускіх народнікаў стала выданне:**

1) "К белорусской молодежи";
2) "Письма о Белоруссии. Письмо первое";

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) "Послание к землякам-белорусам. По поводу "Первого письма о Белоруссии";

4) "Гомон".

**Варыянт 2**

**Псеўданім аўтара выдання "Письма о Белоруссии". Письмо первое":**

1) Даніла Баравік;
2) Шчыры Беларус;
3) Беларус;
4) Яська-гаспадар з-пад Вільні.

**Варыянт 3**

**Псеўданім аўтара выдання "Послание к землякам-белорусам. По поводу "Первого письма о Белоруссии":**

1) Даніла Баравік;
2) Шчыры Беларус;
3) Беларус;
4) Яська-гаспадар з-пад Вільні.

**Варыянт 4**

**Часопіс "Гомон" – гэта выданне:**

1) падпольнае рускамоўнае;
2) падпольнае беларускамоўнае;
3) афіцыйнае рускамоўнае;
4) афіцыйнае беларускамоўнае;

**Варыянт 5**

**Поўная назва часопіса "Гомон":**

1) "Гомон. Белорусское социально-революционное обозрение";
2) "Гомон. Русское социально-революционное обозрение";
3) "Гомон. Белорусское революционное обозрение";
4) "Гомон. Белорусское обозрение";

**Варыянт 6**

**Першая прыватная газета на Беларусі – гэта:**

1) "Минский листок";
2) "Гомон";
3) "Друг народа";
4) "Белорусский вестник".

**Варыянт 7**

**Калі выходзіла газета "Минский листок"?**

1) з 1886 г. па 1902 г. ;
2) з 1886 г. па 1917 г. ;
3) з 1886 г. па 1920 г. ;
4) з 1890 г. па 1902 г.

**Варыянт 8**

**На якой мове выходзіла газета "Минский листок"?**

1) на рускай;
2) на беларускай;
3) на польскай;
4) на яўрэйскай.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 9**

**Хто першапачаткова рэдагаваў "Минский листок" ?**

1) І. Фацінскі;
2) С. Мацвееў;
3) А. Адынец;
4) А. Марціноўскі.

**Варыянт 10**

**Хто не рэдагаваў газету "Минский листок"?**

1) І. Фацінскі;
2) С. Мацвееў;
3) А. Адынец;
4) А. Мацкевіч.

**Варыянт 11**

**Газета "Минский листок" мела падзагаловак:**

1) "Грамадска-літаратурная газета";
2) "Грамадская газета";
3) "Літаратурная газета";
4) "Грамадска-літаратурны часопіс";

**Варыянт 12**

**Упершыню на старонках "Минского листка" была надрукавана паэма:**

1) "Тарас на Парнасе";
2) "Новая зямля";
3) "Сымон-музыка";
4) "Сон на кургане".

**Варыянт 13**

**Газета "Минский листок" выходзіла на працягу:**

1) 7 гадоў;
2) 2 гадоў;
3) 5 гадоў;
4) 16 гадоў.

**Варыянт 14**

**З 1888 г. рэдакцыя газеты "Минский листок" выдавала неперыядычны навукова-папулярны літаратурна-публіцыстычны дадатак:**

1) "Северный календарь";
2) "Северо-Западный календарь";
3) "Западный календарь";
4) "Календарь".

**Варыянт 15**

**З 1(14) лістапада 1902 г. замест "Минского листка" стала выходзіць газета:**

1) "Северный край";
2) "Северо-Западный край";
3) "Западный край";
4) "Северо-Восточный край".

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Блок № 7

# ДРУК БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

**Варыянт 1**
**Калі выйшла газета "Белорусский вестник"?**
1) у 1895 г.;
2) у 1900 г.;
3) у 1901 г.;
4) у 1904 г.

**Варыянт 2**
**Газета "Белорусский вестник" была заснавана:**
1) І. Фацінскім;
2) С. Мацвеевым;
3) П. Бывалькевічам;
4) А. Мацкевічам.

**Варыянт 3**
**Дзе выходзіла газета "Белорусский вестник"?**
1) у Віцебску;
2) у Вільні;
3) у Мінску;
4) у Гомелі.

**Варыянт 4**
**Калі ў Мінску выйшла газета "Северо-Западный край"?**
1) у 1902 г.;
2) у 1900 г.;
3) у 1901 г.;
4) у 1904 г

**Варыянт 5**
**Колькі ўсяго выйшла нумароў газеты "Северо-Западный край"?**
1) 501;
2) 601;
3) 1018;
4) 801.

**Варыянт 6**
**Хто першапачаткова рэдагаваў газету "Северо-Западный край"?**
1) І. Фацінскі;
2) С. Мацвееў;
3) А. Адынец;
4) М. Мысакоўскі.

**Варыянт 7**
**М. Мысакоўскі, рэдактар газеты "Северо-Западный край", паходзіў**
1) з сялян Саратаўскай губерні;
2) з рабочых Саратаўскай губерні;
3) з сялян Магілёўскай губерні;
4) з рабочых Мінскай губерні.

**Варыянт 8**
**На змену якому выданню прыйшла газета "Северо-Западный край"?**
1) "Северный край";
2) "Минский листок";
3) "Западный край";
4) "Северо-Восточный край".

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 9**

**Газета "Северо-Западный край" стала выданнем, якое надрукавала першы беларускамоўны верш будучага класіка беларускай літаратуры**

1) Я. Купалы;
2) Я. Коласа;
3) Цёткі;
4) М. Багдановіча.

**Варыянт 10**

**У час з 10 чэрвеня па 28 кастрычніка 1905 г., калі газета "Северо-Западный край" не выходзіла, замест яе выдаваліся**

1) "Утреннне телеграммы типографии М. Мысаковского";
2) "Утреннне телеграммы";
3) "Утреннне телеграммы М. Мысаковского";
4) "Телеграммы типографии М. Мысавского.

**Варыянт 11**

**Чаму на працягу ліпеня-кастрычніка 1905 г. выхад газеты "Северо-Западный край" быў прыспынены?**

1) рэдакцыя пераехала ў іншы горад;
2) па матэрыяльных прычынах;
3) М. Мысакоўскі ў гэты час адбываў тэрмін пакарання;
4) М.Мысакоўскі адмовіўся ад пасады рэктара.

**Варыянт 12**

**З якога года газета "Северо-Западный край" стала выходзіць без цэнзуры?**

1) з 1902 г.;
2) з 1903 г.;
3) з 1904 г.;
4) з 1905 г.

**Варыянт 13**

**Якую газету выдаў у 1902 годзе гурток "Беларуская рэвалюцыйная партыя"?**

1) "Свабода";
2) "Северо-Западный край";
3) "Северо-Западное слово";
4) "Утреннне телеграммы типографии М. Мысавского".

**Варыянт 14**

**Колькі асобнікаў газеты "Свабода" выйшла ў 1902 годзе?**

1) 1;
2) 2;
3) 10;
4) 20.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 15**
**На якой мове выходзіла газета "Свобода"?**
1) на рускай;
2) на беларускай;
3) на польскай;
4) на яўрэйскай.

## Блок № 8

## ХАРАКТАРЫСТЫКА ДЗЕЙНАСЦІ ГАЗЕТ "НАША ДОЛЯ", "НАША НІВА"

**Варыянт 1**
**Упершыню газета "Наша ніва" выйшла:**
1) 23 лістапада 1906 г.;
2) 23 лістапада 1907 г.;
3) 23 лістапада 1908 г.;
4) 23 лістапада 1917 г.

**Варыянт 2**
**У 1906 годзе ў газеце "Наша ніва" працавалі вядомыя публіцысты і літаратары. Хто з пералічаных асоб не супрацоўнічаў з выданнем?**
1) А. Уласаў;
2) В. Ластоўскі;
3) Я. Купала;
4) Ф. Багушэвіч.

**Варыянт 3**
**Выданне газеты "Наша ніва" было канчаткова спынена:**
1) 7 жніўня 1915 г.;
2) 7 жніўня 1916 г.;
3) 7 жніўня 1917 г.;
4) 7 жніўня 1918 г.

**Варыянт 4**
**Якая партыя выдавала газеты "Наша доля", "Наша ніва"?**
1) БСГ;
2) кадэты;
3) сацыялісты-рэвалюцыянеры;
4) РСДРП(б).

**Варыянт 5**
**Першыя чатыры нумары "Нашай нівы" падпісаны:**
1) С. Вольскім;
2) А. Уласавым;
3) В. Ластоўскім;
4) Я. Купалам.

**Варыянт 6**
**Да "ніжняй" палаты "Нашай нівы" належаў:**
1) Уласаў;
2) Луцкевіч;
3) Манькоўскі;
4) Ядвігін Ш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 7**

**У "верхнюю" палату "Нашай нівы" ўваходзілі:**

1) Ядвігін Ш.;
2) Я. Купала;
3) В. Ластоўскі;
4) А.Уласаў.

**Варыянт 8**

**Апошнім рэдактарам "Нашай нівы" ў 1915 годзе быў:**

1) С. Вольскі;
2) А. Уласаў;
3) В. Ластоўскі;
4) Я. Купала.

**Варыянт 9**

**Першай масавай легальнай газетай на беларускай мове з'яўляецца:**

1) "Наша доля";
2) "Минские губернские ведомости";
3) "Северо-Западный край";
4) "Минский листок".

**Варыянт 10**

**Колькі выйшла нумароў газеты "Наша доля"?**

1) 6;
2) 5;
3) 3;
4) 15.

**Варыянт 11**

**Газета "Наша доля" выходзіла ў перыяд:**

1) 14 верасня – 14 снежня 1906 г.;
2) 14 студзеня – 14 снежня 1906 г.;
3) 14 верасня –14 кастрычніка 1906 г.;
4) 14 студзеня – 14 лістапада 1906 г.

**Варыянт 12**

**Хто быў афіцыйным рэдактарам-выдаўцом газеты "Наша доля" (акрамя 5 нумара)?**

1) І. Тукеркес;
2) С. Вольскі;
3) А. Уласаў;
4) А. Пашкевіч.

**Варыянт 13**

**Дзе выходзіла газета "Наша доля"?**

1) у Кіеве;
2) у Маскве;
3) у Вільні;
4) у Мінску.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 14**
**Каго нельга аднесці да кола неафіцыйных рэдактараў газеты "Наша доля"?**
1) К. Гаворскага;
2) Ф. Умястоўскага;
3) А. Луцкевіча;
4) А. Пашкевіч.

**Варыянт 15**
**У першым нумары газеты "Наша доля" не быў надрукаваны твор:**
1) апавяданне "Прысяга над крывавымі разорамі" Цёткі;
2) верш "Наш родны край" Я. Коласа;
3) апавяданне "Суд" Ядвігіна Ш.;
4) верш "Мужык" Я. Купалы.

## Блок № 9

## ЖУРНАЛІСТЫКА БЕЛАРУСІ Ў 1918-1928 ГАДЫ

**Варыянт 1**
**Першай бальшавісцкай газетай на Беларусі стала:**
1) "Свабода";
2) "Северо-Западный край";
3) "Северо-Западное слово";
4) "Звезда".

**Варыянт 2**
**Калі начала выходзіць газета "Звезда"?**
1) 1917 г.;
2) 1925 г.;
3) 1927 г.;
4) 1930 г.

**Варыянт 3**
**Першапачаткова газета "Звезда" – гэта:**
1) орган Мінскага камітэта;
2) орган Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б);
3) орган БСГ;
4) орган Мінскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

**Варыянт 4**
**Хто з пералічаных асоб не прымаў удзелу ў стварэнні масавай газеты ў сістэме бальшавісцкай прэсы?**
1) М.Фрунзе;
2) А.Мяснікоў;
3) К. Гаворскі;
4) В.Кнорын.

**Варыянт 5**
**На якой мове выходзіла газета "Звезда" да 1925 г.?**
1) на рускай;
2) на беларускай;
3) на польскай;
4) на рускай і беларускай.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 6**

**На якой мове выходзіла газета "Известия Могилевского Совета рабочих и солдатских депутатов" з 1927 г.?**

1) на рускай;
2) на беларускай;
3) на польскай;
4) на рускай і беларускай.

**Варыянт 7**

**На якой мове выходзіла газета "Звезда" з 1927 г.?**

1) на рускай;
2) на беларускай;
3) на польскай;
4) на рускай і беларускай.

**Варыянт 8**

**Калі 25 жніўня 1917 г. "Звезда" была закрыта Часовым урадам, то 15 верасня замест яе пачало выходзіць выданне пад назвай:**

1) "Молот";
2) "Северо-Западный край";
3) "Северо-Западное слово";
4) "Буревестник".

**Варыянт 9**

**8 кастрычніка 1917 г. газета "Звезда" выйшла пад назвай:**

1) "Молот";
2) "Северо-Западный край";
3) "Северо-Западное слово";
4) "Буревестник".

**Варыянт 10**

**Калі газета "Звезда" ўзнавіла сваю назву?**

1) 25 жніўня 1917 г.;
2) 15 верасня 1917 г.;
3) 8 кастрычніка 1917 г.;
4) 1 лістапада 1917 г.

**Варыянт 11**

**Якое выданне не выходзіла ў 1917 годзе?**

1) "Звезда";
2) "Бюллетень Минского Совета рабочих и солдатских депутатов";
3) "Известия военно-революционного комитета города Витебска";
4) "Минский листок".

**Варыянт 12**

**"Минская газета" – гэта выданне, якое:**

1) выступала за бальшавікоў;
2) выступала супраць бальшавікоў;
3) не прапаноўвала палітычнай пазіцыі;
4) проста з'яўлялася камерцыйным.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 13**

**Грамадска-палітычны часопіс "Вольны сцяг" выдаваў:**

1) Камісарыят Народнай асветы Беларусі;
2) меншавікі;
3) эсэры;
4) бундаўцы.

**Варыянт 14**

**На якой мове выходзіў грамадска-палітычны часопіс "Вольны сцяг"?**

1) на рускай;
2) на беларускай;
3) на польскай;
4) на рускай і беларускай.

**Варыянт 15**

**Хто з пералічаных асоб не прыняў удзелу ў выданні грамадска-палітычнага часопіса "Вольны сцяг"?**

1) Ц. Гартны;
2) Я. Карскі;
3) М. Гарэцкі;
4) Цётка.

## Блок № 10

## СТВАРЭННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ

**Варыянт 1**

**Дзе была створана першая беларуская трансляцыйная радыёстанцыя?**

1) у Гомелі;
2) у Мінску;
3) у Вільні;
4) у Магілёве.

**Варыянт 2**

**Калі была адкрыта трансляцыйная радыёстанцыя ў Гомелі?**

1) у 1922 г.;
2) у 1923 г.;
3) у 1924 г.;
4) у 1925 г.

**Варыянт 3**

**Калі пачала працаваць Мінская рэспубліканская радыёстанцыя?**

1) у 1922 г.;
2) у 1923 г.;
3) у 1924 г.;
4) у 1925 г.

**Варыянт 4**

**Спачатку на беларускім радыё працавалі ў асноўным:**

1) журналісты з газет;
2) медыкі;
3) рабочыя;
4) настаўнікі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 5**

**Якую з пералічаных радыёперадач можна аднесці да радыёгазеты на беларускім радыё?**

1) "Чырвонаармвйская радыёгазета";
2) "Радыёклуб баявой славы";
3) "Радыёчасопіс для жанчын";
4) "Музычны радыёзборнік".

**Варыянт 6**

**Якую з пералічаных радыёперадач можна аднесці да радыёклуба на беларускім радыё?**

1) "Чырвонаармейская радыёгазета";
2) "Радыёчасопіс для жанчын";
3) "Радыёклуб баявой славы";
4) "Музычны радыёзборнік".

**Варыянт 7**

**Якую з пералічаных радыёперадач можна аднесці да радыёчасопіса на беларускім радыё?**

1) "Радыёклуб баявой славы";
2) "Радыёчасопіс для жанчын";
3) "Чырвонаармейская радыёгазета";
4) "Музычны радыёзборнік".

**Варыянт 8**

**Якую з пералічаных радыёперадач можна аднесці да радыёзборніка на беларускім радыё?**

1) "Музычны радыёзборнік";
2) "Чырвонаармейская радыёгазета";
3) "Радыёклуб баявой славы";
4) "Радыёчасопіс для жанчын.

**Варыянт 9**

**"Беларуская вёска" – гэта:**

1) радыёгазета;
2) радыёзборнік;
3) радыёчасопіс;
4) радыёклуб.

**Варыянт 10**

**Асноўная тэматыка перадачы "Чырвоная змена":**

1) сацыялістычныя пераўтварэнні на вёсцы, барацьба з кулакамі;
2) увесь спектр піянерскага руху, школьнае жыццё, быт, адпачынак, мастацкая самадзейнасць;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) універсальная;

4) маладзёжная: аўтары заклікалі маладых людзей вучыцца, напружана працаваць, укараняць новы быт, уступаць у камсамол;

**Варыянт 11**

**Асноўныя тэматыка перадачы "Савецкая Беларусь":**

1) універсальная;

2) маладзёжная: аўтары заклікалі маладых людзей вучыцца, напружана працаваць, уступаць у камсамол;

3) увесь спектр піянерскага руху, школьнае жыццё, мастацкая самадзейнасць;

4) сацыялістычныя пераўтварэнні на вёсцы, барацьба з кулакамі;

**Варыянт 12**

**Асноўныя тэматыка перадачы "Піянер Беларусі":**

1) увесь спектр піянерскага руху, школьнае жыццё, мастацкая самадзейнасць;

2) універсальная;

3) сацыялістычныя пераўтварэнні на вёсцы, барацьба з кулакамі;

4) маладзёжная: аўтары заклікалі маладых людзей вучыцца, напружана працаваць, уступаць у камсамол.

**Варыянт 13**

**Асноўныя тэматыка перадачы "Беларуская вёска":**

1) сацыялістычныя пераўтварэнні на вёсцы, барацьба з кулакамі;

2) маладзёжная: аўтары заклікалі маладых людзей вучыцца, напружана працаваць, укараняць новы быт, уступаць у камсамол;

3) увесь спектр піянерскага руху, школьнае жыццё, быт, адпачынак, мастацкая самадзейнасць;

4) універсальная.

**Варыянт 14**

**Якія перамены адбыліся на беларускім радыё ў пачатку 30-х гадоў XX стагоддзя?**

1) былі ліквідаваны рэдакцыі радыёгазет і быў створаны асобны сектар "Апошнія паведамленні", які рыхтаваў выпускі навін чатыры разы на дзень;

2) былі ліквідаваны рэдакцыі радыёгазет;

3) быў створаны асобны сектар "Апошнія паведамленні", які рыхтаваў выпускі навін чатыры разы на дзень;

4) былі пашыраны рэдакцыі радыёгазет.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 15**

**28 снежня 1933 г. быў створаны:**

1) Камітэт радыёінфармацыі і радыёвяшчання;
2) Камітэт па радыёінфармацыі;
3) Камітэт радыёвяшчання;
4) Камітэт радыёінфармацыі.

# Блок № 11

# ЖУРНАЛІСТЫКА БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШЫХ ПЯЦІГОДАК

**Варыянт 1**

**У 1927-28 гг. у рэспубліцы выходзіла:**

1) 10 газет;
2) 50 газет;
3) 100 газет;
4) 26 газет.

**Варыянт 2**

**Ці выходзілі ў 30-я гады XX стагоддзя на Беларусі выданні на польскай мове?**

1) не;
2) так, 1 выданне;
3) так, 2 выданні;
4) так, 8 выданняў.

**Варыянт 3**

**З якога года газета "Звезда" поўнасцю пачала выходзіць на беларускай мове?**

1) з 1927 г.;
2) з 1930 г.;
3) з 1931 г.;
4) з 1932 г.;

**Варыянт 4**

**У 1930 г. былі ліквідаваны акругі. Пастановай ЦК ВКП(б) ад 11 жніўня "Аб рэарганізацыі сеткі газет у сувязі з ліквідацыяй акруг" прадугледжвалася:**

1) выпускаць акруговыя выданні;
2) выпускаць калгасныя выданні;
3) выпускаць фабрычныя выданні;
4) на аснове ліквідаваных акруговых, калгасна-саўгасных, асобных фабрычна-заводскіх газет разгарнуць сетку раённых газет.

**Варыянт 5**

**Колькі ў 1930-1931 гг. на Беларусі выходзіла раённых газет?**

1) 36;
2) 100;
3) 200;
4) 1000.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 6**

**Які тыраж складалі беларускія газеты ў пачатку 30-х гадоў?**

1) больш за 10 млн. экземпляраў;
2) больш за 100 млн. экземпляраў;
3) больш за 1000 млн. экземпляраў;
4) больш за 500 млн. экземпляраў.

**Варыянт 7**

**Калі была прынята Пастанова ЦК ВКП(б) "Аб рэарганізацыі сеткі газет у сувязі з ліквідацыяй акруг"?**

1) у 1930 г.;
2) у 1931 г.;
3) у 1932 г.;
4) у 1933 г.

**Варыянт 8**

**У снежні 1922 г. выйшаў першы нумар часопіса літаратуры, палітыкі, культуры, эканомікі і публіцыстыкі**

1) "Маладосць";
2) "Полымя";
3) "Вожык";
4) "Могилевские епархиальные ведомости".

**Варыянт 9**

**Які часопіс стаў цэнтрам аднайменнага літаратурнага грамадскага аб'яднання, якое афармілася ў канцы 1923 г. як арганізацыя маладых пралетарскіх пісьменнікаў?**

1) "Маладосць";
2) "Полымя";
3) "Вожык";
4) "Могилевские епархиальные ведомости".

**Варыянт 10**

**26 лютага 1932 г. выйшаў першы нумар газеты "Літаратура і мастацтва", якая з'яўлялася друкаваным органам:**

1) ЦК Камуністычнай партыі БССР;
2) Федэрацыі аб'яднанняў савецкіх пісьменнікаў;
3) Федэрацыі аб'яднанняў савецкіх пісьменнікаў і Галоўмастацтва БССР;
4) Галоўмастацтва БССР.

**Варыянт 11**

**Адна з важных тэм, якая абмяркоўвалася на старонках беларускай прэсы 30-х гадоў XX стагодзя – гэта:**

1) развіццё эканомікі ЗША;
2) рынчныя зносіны Беларусі;

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3) стаханаўскі рух;
4) барацьба супраць фашысцкіх захопнікаў.

**Варыянт 12**
**Хто з беларускіх пісьменнікаў у 30-я гады XX стагоддзя прымаў актыўны ўдзел у друку?**
1) Я.Купала;
2) У. Караткевіч;
3) В. Быкаў;
4) Б. Сачанка.

**Варыянт 13**
**Для больш глыбокага адлюстравання праблем індустрыялізацыі з ліпеня 1927 г. пачала выходзіць спецыяльная газета "Рабочий" – друкаваны орган:**
1) ЦК Камуністычнай партыі Беларусі;
2) Федэрацыі аб'яднанняў савецкіх пісьменнікаў;
3) Федэрацыі аб'яднанняў савецкіх пісьменнікаў і Галоўмастацтва БССР;
4) Галоўмастацтва БССР.

**Варыянт 14**
**У канцы 20-х гадоў XX стагоддзя колькасць беларускамоўных выданняў:**
1) павялічвалася нязначна (да 10 выданняў);
2) не павялічылася;
3) павялічылася больш чым на 1000 выданняў;
4) павялічылася больш чым на 25 выданняў.

**Варыянт 15**
**У чэрвені 1924 г. выйшаў першы нумар часопіса "Асвета" – друкаванага органа:**
1) Народнага камісарыята асветы;
2) Федэрацыі аб'яднанняў савецкіх пісьменнікаў;
3) Федэрацыі аб'яднанняў савецкіх пісьменнікаў і Галоўмастацтва БССР;
4) Галоўмастацтва БССР.

## Блок № 12

## ДРУК ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

**Варыянт 1**
**Выданне "Бальшавік" – друкаваны орган:**
1) Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі;
2) Камуністычнай партыі Польшчы;
3) Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі;
4) Таварыства беларускай школы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт 2**

**“Глос комуністычны” – друкаваны орган:**

1) Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі;
2) Камуністычнай партыі Польшчы;
3) Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі;
4) Таварыства беларускай школы.

**Варыянт 3**

**Выданне камуністычнай партыі Заходняй Беларусі –**

1) “Чырвоны штандар”;
2) “Грамада”;
3) “Вясковы пралетарый”;
4) “Чырвоны сцяг”.

**Варыянт 4**

**У якім годзе пачала выходзіць газета “Чырвоны сцяг”?**

1) у 1931 г.;
2) у 1932 г.;
3) у 1933 г.;
4) у 1934 г.

**Варыянт 5**

**Выданне камуністычнай партыі Польшчы 20-х гадах XX стагоддзя:**

1) “Звезда”;
2) “Бальшавік”;
3) “Вясковы пралетарый”;
4) “Чырвоны сцяг”.

**Варыянт 6**

**У якім годзе пры ЦК КПЗБ былі створаны Цэнтральная рэдакцыя і Цэнтральная тэхніка, якія сталі займацца абсталяваннем друкарняў, выданнем і распаўсюджваннем нелегальнай літаратуры?**

1) у 1923 г.;
2) у 1924 г.;
3) у 1925 г.;
4) у 1926 г.

**Варыянт 7**

**“Наш сцяг” – друкаваны орган:**

1) Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі;
2) Камуністычнай партыі Польшчы;
3) Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі;
4) Таварыства беларускай школы.

**Варыянт 8**

**Хто з класікаў беларускай літаратуры супрацоўнічаў з газетамі Беларускай рэвалюцыйнай грамады?**

1) Цётка;
2) М. Гарэцкі;
3) Ф. Багушэвіч;
4) П. Багрым.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Варыянт**

**У студзені 1924 г. БРА поўнасцю перайшла на пазіцыі Кампартыі і ўлілася ў яе склад. Што адбылося з выданнямі БРА?**

1) выданне газет БРА не было спынена;

2) выданне газет БРА было спынена, акрамя газеты "Вольны сцяг";

3) выданне газет БРА было спынена, акрамя газеты "Наш сцяг";

4) выданне газет БРА было спынена, а лепшыя журналісцкія кадры папоўнілі рэдакцыі выданняў КПЗБ.

**Варыянт 10**

**"Беларуская справа" – друкаваны орган:**

1) Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі;

2) Камуністычнай партыі Польшчы;

